# *Адкуль вёска Струбніца*





***На гэтым месцы кагда-то рос бальшы лес. І вот аднажды прыехалі сюды князья, хто тамака яшчэ раньшэ жылі, і адна пані заблудзілася з багатай сям'і. І куды яна не пойдзе - усюды лес.***

***І во яна прыйшла на тое месца, пад Плебанаўцы, туды, дзе ў настаяшчае ўрэмя касьцёл стаіць, і там немножка такі быў узгорачак. А як яе найсьці?***

***І тады сталі ўсе трубіць у горны, у трубы такія былі. І вот ад гэтага названьня, што яны трубіліў тыя трубы, каб яна выйшла, і пайшло наша названьне вёскі Струбніца. Ад названьня труба, трубіць.***